БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

[Рэ]дакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
[Ад]міністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
[Рэ]дакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру[б.]
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 75. Менск. Серада 26 чэрвеня 1918 г. Год I

Менск 26/VI.

Канец большэвіцкаго раю.

Сыбір адрэзана ад Масковіі, [чэ]хо-словацкія дружыны, нівя[д]кія а рэгулярныя, эуропэйскія [ва]йскі, разганяюць як вераб'[ёў] банды большэвіцкіх красноармейцау, ужо перэваліл[і] Урал [за]нялі Самару, Сызрань. У [гэ]тай рабоце відаць руку Ая[нц]ii і Амэрыкі. Са стараны [До]на дзействуюць казакі. Крас[нó]ва і гэрманскія войскі. Каль[цо] вругом Большэвізіі сцягівацца тужэй са усіх старон. Вя[лі]каросія ужо ні будзе мець і [сы]бірскаго хлеба. Замест со[цы]ялістычнаго рая на зямлі, [вы]йшло галоднае пекло, адны [то]лькі тысячы камісароу і [кр]аснаармейцау грабуць грошы [і] адбіраюць хлеб, дзе могуць, [а] як жаліцца адзін большэвіц[кі] «губэрнатар» Солонко, усе [к]амісары пьянствуюць і бя[р]уць хабары.

Расходы большэвіцкой каз[ны] на 6 месяцоу 1918 г. [вы]шчытаны на 100 міліардэу. [У]весь рабочы кляс жывець на [к]азенны кошт. 1 верста чу[гу]нкі даець 80 тысяч руб. [стра]тку, бо тэлеграфісты бяруць 10000 руб. у год і т. д. Усе [ба]часьце, што ад нас Гэрманія [вы]грэбла большэвікоу. У нас [у]се заселяно, ураджай здаецца [бу]дзе добры і край паба[г]ацеець ужо ні на паперовыя грошы, а на рэяльны капітал, [п]радукты замляробства. Хаця [м]ейсцамі вескам абобраным [р]эквізыцыямі расійскай арміі трудна дацягнуць да новаго хлеба.

Агульныя вееткі.

ВЕНА, 21/VI. Спэцыяльная аўстро-вэнгерская дэлегацыя адправіцца у Маскву, каб абгаварыць с савецкім урадам агульныя фінансавыя абавязковасьці.

КЕЛЬН, 21/VI. Як даведываецца «Кольнішэ Цэйтунг», пражываючыя у Злучаных Штатах 100,000 расійскіх падданых звярнуліся да амэрыканскаго ураду с прозьбай, у якой прасілі аб дазволу вярнуцца у Расію, каб там прынімаць учасьце у рэарганізацыі краю. Амэрыканскім урадам гэта прозьба была адсунута с той прычыны, што прасіцелі раней павінны адбыць воінскую павіннасьць. У хуткім часе стане пытанне аб прымусовай рэкрутыроўцы у амэрыканскую армію. Вялікі лік расійскіх еўрэяў уцёк у Канаду, каб гэтакім чынам ратавацца ад прымусовай ваеннай службы.

РОТТЭРДАМ, 21/VI. Дэпутат лібэрал Морэіль ўнёс у парлямэнт вось якое прапанаванне. Парлямэнт жадае атрымаць ад ураду запэўненасьць у тым, што пры мажлівасьці уладжэння ваеннаго пытання агульнай згодай ні будуць упушчаны ніякія дыплёматычныя выпадкі. Усе тайныя згоды с хаурўснікамі павінны быць праверапы, дзеля таго што цяпер яны ні тасуюцца з мэтамі, дзякуючы якім Англія начала вайну і зпачэ служаць тормазом да дасьціжэння дэмократычнаго міру. Затым Морэіль апавешчаў пасьля гэтаго, што народ заніпакояны ходам вайны і дзеля гэтаго мае права вымагаць ад ўрада у новаго абвяшчэння іх ваенных мэт. Ва усіх ваюючых землях прыкмечаецца павялічаны рух за справядлівы мір.

БЭРЛІН, 21/VI. Чэхо-словацкае паўстанне прадаўжаецца і шкодзіць зносінам па сібірскім жалезным дарогам, а так сама дастаўцы харчоў у прамысловыя цэнтры. Становішчо у Пэнзі згоршылося, дзеля таго што места знаходзіцца пад ўладарствам поўстанцаў, узброенных броніраванымі аўтамабілямі і артылерыяй. Паміж савецкімі вайскамі і чэхо-словакамі ідзець сурьёзны бой. На нібяспечныя пункты адпраўлены з усіх бакоў падмацаванні. Цяпер чэхо-словакі заўладалі местамі Ніас, Кузнецк, Чэлябінск і ж. д. пуцямі. Усьмірэння поўстання можна чэкаць у бліжэйшыя дні.

БЭРЛІН. С прычыны Ліфляндско-Эстляндскай выстаўкі у Акадэміі Штукарств ідзець рад навуковых рэфэратаў, якія павінны, як і сама выстаўка асьветляць розныя пытанні Балційскаго краю. Рэфэраты адчыніліся дакладам статскаго саветніка прафэсара Куперэа (Рыга) на тэмат: «Пабочная прылежнасьць і граніца ўсходня-балційскаго краю». Па пытанню аб насяленнасьці гаворыць тайны саветнік прафэсар Бэдэн—Бэргор (Кенігсбэрг) у дакладзе аб этнологіі Балційскаго краю.

Весткі з Расіі.

— **Масква, 22/VI** (П.Т.А.). Пасля ўзяцця Омска чэхо-словакі маршыравалі на Табольск і Іехцін. Пасьля бітвы ад—8 і 9 чэрвеня лічбенная сіла чэхо-словакаў адкінула савецкія войскі у папрамак на Козонцін і Чэлябінск.

— **Масква, 21/VI.** С чэхо-словацкаго фронта паведамляюць, што пасьля кароткай бітвы на фронце Сыбір—Урал савецкія войскі у напрамку на Уральск занялі Гаслінскія заводы, у 125 вёрстах ад Кацэрынбурга ў 160 вёрстах ад Чэлябінска. Такім чынам палова жалезнай дарогі Кацэрынбург — Чэлябінск знаходзіцца у руках савецкіх войск. Паўночна—заходней Чэлябінска стаяць сем атрадаў чэхо-словацкіх войск з двума лёгкімі і двума цяжкімі гарматамі. Генэрал Дутоў як бы то злучыўся с чэшскімі вайскамі ніцадалёку ад станцыі Паварот. Новы Сыбірскі урад апавешчыў усю Омскую лінію на ваенным становішчы с прычын нападзенняў зробленых жалезнадарожнікамі на чэхаў па лініі Омск—Цюмень. Чэхі і казакі пад камандай французскіх ахвіцэраў наступаюць на Чэлябінск. Згодна «Извѣстіямъ», Савецкі урад усе мейсцовасьці ўсходна - сыбірскай дарогі апавешчыў на ваенным становішчы. Апрача таго, ўсе рабочыя і збяднеўшыя селяне ад 18 гадоў прызваны на ваенную службу.

Весткі с Польшчы.

ВАРШАВА, 21/VI. Урочыстае адчыненне Дзержаўнай Рады, па вестнам газэты «Пшэглёнд Поранны», адбудзецца 22-го чэрвеня у 11 гадзін рання. Член Рэгенцкай Рады будзе чытаць ўручаную яму міністрам народных спраў пасадную прамову.

Паводлуг ведамасьцей «Jidische Rundschau», у Варшаве і Лодзі у апошніх часах на усіх крыжавінах вуліц расклеівалі праклямацыі с прызывам да жыдоускіх пагромау. Між іншым, тамака было напісано:

„Жыдоускія банды рабуюць Польшчу. Жыды вызываюць між намі нязгоду і грамадзкую вайну. Трэба палажыць канец жыдоускім інтрыгам. За сваю ганебную палітыку жыды будуць пакараны. Трэба зьнішчыць гэту банду. Гэтым жыдам трэба даць навуку".

Урадовыя уласьці гэтых праклямацый зусім ні нішчылі. На запытанне міліцыанты адказвалі, што ім гэтаго ні загадывалі. А у той жэ час жыдоускім газэтам польскія уласьці забаранілі штоколечы пісаць аб гэтых праклямацыях. Жыдоускае насяленне вельмі устрывожэно, баяцца жыдоускаго пагрому.

Што гэная праклямацыя — плод палітычнай афэры, відаць с таго, што творыцца у Галічыне. 4 чэрвеня у Львове былі разасланы жыхарам лісткі с пытаннямі аб нацыянальнасьці; пры гэтым было заяўлено, што на пытанне, якім языком хто гаворыць, ні у якім здарэнні нельга пісаць, што па жыдоуску. Пратэстау проці гэтаго ні дапускалі. Мэта гэтаго — зусім ясная: жыдоу хочуць прымусіць запісывацца палякамі. У Польшчы відаць, вядзецца такая-ж палітыка: жыдоу пужаючы хочуць давясьці да таго, каб яны прызнавалі сябе за палякоу жыдоускае веры".

«Гоман».

З Украіны

КІЕУ, 20/VI. У працяг расійска-украінскіх умоваў аб граніцах, украінская мірная дэлегацыя абгрунтавала сваі вымаганні тым, што стратэгічнае становішчо ствoранай новай дзержавы часто патрабуе расшырэння сваей тэрыторыі за рахунак этнографічнаго прынцыпа. Ракоўскі адпаведаў, што украінскія пажаданні «мѣтятъ» толькі на расійскія вобласьці. У камісіі па таварaабмену вялікаросы патрэбавалі права закупкі хлеба у раду украінскіх мест. Украінцы пажадалі пакуль што пытанне а пастаўцы хлеба адлажыць, а тым часам прапанавалі вугаль, фрукты, жалезо, ткані, шкло, смазачнае масло, абутак і паперу. Расійская дэлегацыя заявіла, што ткані могуць быць абменяны толькі на хлеб. Нефт, с прычын малых запасаў, можа адпускацца вельмі мала.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У Скарбовай палаці перэдаюць аб вярнуушэйся з Масвы дэлегацыі служачых, ездзіушай туды дзеля выяснення пытання аб долі установы у зьвязі с прапанаваннем аб эвакуацыі яе у адну с цэнтральных губэрняу Расіі.

Дэлегацыя у радзе камісарау ясных рашэнняу ні дабілася.

Тым ні меней, нікаторым с палацкіх служачых удалося прыкамандзіравацца «на усялякі выпадак» да маскоускай скарбовай палаты.

Пэнсія у мейсцовай палаце ад 1-го ліпня мае быць павялічана у зьвязі с павялічываючыміся паступленнямі зборау у губ. казначэйство.

Хлебны паек з будучаго тыдня, с прычын паменьшэння мучных запасау, зьменшаны с 3½ ф. на 3 ф. на порцыю.

У хуткім часе меські харчовы камітэт с прычын агульных нідахватау у арганізацыі справы, пераходзіць цалком пад кірауніцтво нямецкаго градоначальства.

Упраулюючым скарбовай палатай назначаецца начальнік аддзелення Смірноу.

Чародная выдача прадуктау па бонам—1 ф. цукру, 1 пудэлка сернічак, 1 ф. солі і ½ ф. сушанай агародніны пачата учора, г. з. 25 чэрвеня.

Падвоз у места нікаторых прадуктау,—малака, яек і сырау—у рыначныя дні мала-памалу павялічываецца.

У хуткім часе дастауляецца вялікая партыя селедцоу с Кіева.

———

Арэндкае пытанне. Сярод арэндатарау на землях землеуласьніка Ваньковіча (Камароука) разасланы павядомасьці, за подпісью паверанаго Паніквіцкаго, дзе прапануецца у вельмі кароткі срок унесьці запушчаную за час вайны нідаімку, у праціунным выпадку проціу нідаімшчыкау (каля 200) пачнуцца іскі а скасаванні умовау, зносе дамоу і выселенні.

Тымі жа рэпрэсіямі пужае кантора архіерэйскаго дома (арэндатароу да 500), катэдральны сабор і інш.

Арэндатары шукаюць абароны у кансультацыях па аказанню юрыдычнай помачы насяленню.

———

Епархіяльнай уладай у хуткім часе, на грунце адказу па запытанню на імя кладбішчэнскай перэспенскай цэркві, найболей багатай па скарбоначных даходах, прапануецца павялічэнне істнуючаго пры ей прычта, якому цяжка спрауляцца са многімі пагрэбальнымі трэбамі.

Апрача таго, лічуць вельмі патрэбнай, с прычын жалоб парахвіян, строгую рэглямэнтацыю пахароннай таксы, вельмі павялічанай за апошні час (за адны провады з дому у цэркау 60—100 руб.).

———

Цэнтральныя рабочыя бюро дзеля падачы безработным добрых заработкау у сельскай гаспадарцы і прамысловасьці Гэрманіі адчынены у пяці местах—Менску, Барысаве, Оршы, Бабруйску і Барановічах.

———

У жаноцкай міністэрскай гімназіі законавучыцель Праваслаунай рэлігіі Маслов пазваляе сабе «укорять» нікаторых вучэніц за учасьце у беларускім руху.

Яшчэ ні выведіся «свои человѣки» быушаго епіскапа—палітыкі Мітрофана — пара ужо, дауно пара!

———

Беларускі хор пад кіраунíцтвам Цераускаго за богаслужэннем у мужскім манастыру у Духоу дзень, г. з. 24 чэрвеня, пець адмовіуся, дзеля прапанаванай яму вельмі скупой платы.

———

Забарона увоза ад 22 чэрвеня распараджэннем градоначальніка Гэршэля разшыраецца на рагатую жывелу, сьвіней целят, авечак, мясо, сало, вэндліну, каубасу, зернавыя хлебы, муку, крупу, картопель, соль і стручкавыя: бобы, гарох, чэчавіцу, рыж і саго.

Забарона вывоза глаунае тычыцца гэрбаты, кавы, какао і дражджэй.

———

У мешчаянскай управе ліквідацыя справау амаль спынілася.

Заправілы, замест падгатоукі да пераходу управы да меськаго самаупраулення, лічуць болей патрэбным «сядзець» на сваіх мейсцах.

———

Т-во патрэбіцелей «Экономіа» грунтуецца пры афіцэрскім бюро. Камісія пры Т-ве, устава якога пацьверджэная пачала сваю працу 20 чэрвеня.

Запісь у члены і паевыя узносы (15 р. і 3 руб. уступного) робіцца ад 23 чэрвеня.

Азначанае патрэбіцельскае Т-во заменіць істнуючае эканамічна афіцэрскае Т-во, намечанае да ліквідацыі.

———

Аднауленне інстытута міравых судзей у губэрні па назначэнню—пытанне, па упорным слухам, некалькіх дзен.

Пры гэтым міравыя судзьзі будуць усе з юрыдычным выкшталцэннем.

АБ УСІМ.

Вільня—места штукарства.

(С „Петроградскаго Эхо» № 56 ад 27/VI—1918 г.).

Пад такім тытулам зьявілася нідаўна у "Вільні пекнае выданне, кніга прыват - доцэнта Вэбэра.

Кніга гэта,'атрымана нідаўна расійскай Акадэміяй Навук і задзівіла як малым коштам так і зграбнасьцю выдання.

Кніга дае шмат аўтатыпаў і зьнімкаў нямецкіх фатографаў. Асобае мейсцо займаюць у кнізі старыя віленскія цэркві, глаўнае жэ узбудаваная у готыцкім стылю Бэрнардынская цэркаў.

Пасьля прагляду гэтай высока—цікавай кнігі прыходзіцца констатыроваць, што намі у працяг дзэсяцілеццяў ні зроблено і дзесятай долі таго, што зрабілі немцы у вобласьці штудявання літоўскай старасьвеччыны за два годы. З абвесткі прыложанай да кнігі відаць што тое самае выдавецтво у хуткім часе мае выпусьціць падобныя апісанні і другіх занятых немцамі мейсц.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 24 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Становішчо без перамен. На р. Анкр і Авр баевая дзеяльнасьць была ўвесь дзень павышанай. Вечарам яна ажывілася так сама і на другіх вучастках фронта. У працяг ночы усілевая разведачная дзеяльнасьць. Усходней Бадонвіллера штурмавыя атрады уварваліся у амэрыканско-францускія акопы, нанесьлі ворагу вялікі урон і захапілі 40 палонных.

Лейтэнант Удэт атрымаў сваі 31 і 32, обэр-лейтэнант Герынг сваі 20 і 21 перамогу у паветры.

Перпіы Генэрал-кватэрмэйстар фон-Людэндорф.

Бібліографія.

———

„Вольная Беларусь" ,№ 22—23 вышоу з друку 23-го чэрвеня 1918 г. Зьмест такі: Рабочы стан пануючых і прыгвалчаных нацый, стацця Я. Л-к; Выстаука «Вільня-Менск»; Прыфронтавы рубеж на Беларусі, нататкі і уражэнні З. Бядуля; Зіма, апаведанне М. Гарэцкаго; «Нюра», разказ Дзеда; Хроніка і др.

Цана асобнаго №—30 кап.

———

БЕЛАРУСКАЯ ГРАММАТЫКА.

Як нам ведама, грамматыка нашаго маладога філолога Б. Тарашкевіча пачата ужо друкам у Петраградзі. Састауленая пад рукаводствам такіх знауцау беларускай мовы, як акадэмік А. Шахматоу і акадэмік Карскі, яна есьць найлепшай с пробау беларускай грамматыкі калі нібудзь робленых. Ні йменне у Менску ці другіх местах Беларусі патрэбных друкарскіх знакау змусіло аутара аддаць яе для друку у Петраград. Сэкрэтарству Асьветы трэба будзе ужыць заходау каб дастаць адтуль патрэбную для школ і саманавучання гэтую гнігу у магчыма большай колькасьці.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

На рэках Вавілону.

(Успамінкі уцекача).

Клікала я прыяцеляу маіх,—
Яны ашукалі мяне».

(Плач Ерэміі, I 19).

IV*).

Натуральна, што даючы «свой» хлеб «сваім» людзям, дзеячы польскіх і расійскіх камітэтаў стараліся абгладзіць, дапасаваць да сваіх патрэб, зрабіць больш сваймі уцекачоў беларусаў і гаратліва узяліся падкормліваць іх сваім патрыотызмам у дадатак да хлеба. З'яўлялася лішні раз і можа найлепшая прамажнасьць па свайму заапекавацца над гэтымі ніпрычэсанымі па іхняму «сваімі» людзьмі і яны гэтай прамажнасьці ні абмінулі, а выкарысталі як найлепей.

Хто кемнейшым і спрытнейшым аказаўся пры гэтым, трудна рашыць. Здаецца аднак, што роўна здольнымі былі і расійцы і палякі. Пры гэтым зазначыць трэба, што расійцы у руссыфікацыі аказалі спрытнейшымі у сябе дома, чым будучы у нас. Тамака можна сказаць яны развярнуліся ў ва ўсю шыр. Школы, бурсы, кнігі, уплыў духавенства, гутаркі пры афіцыяльных зносінах з уцекачамі—усё было пушчано у рух. Як-жа,—надавалася «счастливая возможность» зглынуць у «русскомъ морѣ» беларускую крупіцу, ці-ж можна было яе абмінуць?

Палякі ні адставалі у гэтым ад сваіх /не—прыяцеляў. Ды й ні дзіво, бо для чаго, а для дэпацыяналізацыі так ці іначэй зьвязаных з імі народаў у іх ёсьць свая, старэйшая за рускую мэтода, свая школа. Гэтыя найбольшую увагу зьвярнулі на маладыя пакаленні, бачучы у іх тую сілу, якая возьме жыцце у свае рукі ў нідалёкі час. Старыя беларускія «хлопы» ні так былі цікавы для іх тым болей, што праз дзяцей найлягчэй пераменіць і бацькоў. Асабліва карыснымі для гэтай мэты аказаліся бурсы паадчыняныя імі для моладзі. У гэтых бурсах маладыя душы моцна зашнуроўваліся у пярэстыя шаты польскаго патрыотызму.

Цэлы год такі стан рэчы панаваў у Казані. Паволі уцекачы беларусы, як моладзь так і старшыя паназвычаіваліся палякаваць і маскаляваць ды пакепліваць с тых хто іщчэ трымаўся свайго. Здавалося, што усё беларускае задушано гэтта і «прыяцелі» маглі-б спраўляць блюзьнерскія памінкі па папаўшай сюды беларушчыне.

Але так здавалося толькі. «Свой край,—свой звычай», жылі у сэрцах уцекачоў і жыцце сваё азнаймлялі нудой па сабе. А раз жыла нуда па родным краі—жыва была душа беларуская. Патрэбны былі толькі людзі, каторыя-б здалелі паказаць ёй дарогу з туману якім акуталі яе «дабрачынцы» с чужых камітэтаў. І такія людзі ў хутцэ з'явіліся.

V.

Скора Беларусы на столькі паказалі сябе, што аб іх пачалі гаварыць і у Казанскім грамадзянстве і у Казанскай прэссе. Пачатак гэтаму сваёй працай палажыў Я. Станкевіч. Апісаць варункі гэтай працы і усе што рабіў гэты шчыра беларускі патрыота трэба-б было многа мейсца. Змучаны днём на вучэнні з салдатамі, ён мусіў вечарам ісьці за пяць вёрст у горад і ні завеі з гурбамі сьнегу, ні траскучы мароз ні маглі паўстрымаць яго у лягэры. Ні раз можна было бачыць прапаршчыцкую, усю абвеяную сьнегам, у цяжкіх салдацкіх ботах, пасоўваючуюся позна ноччу у лягэры, хвігуру,—гэта Станкевіч варочаўся з гораду, дзе у якой нібудзь каморацца, у сырым муры і, здаралося, у цемным склепе праводзіў ён вечар, чытаючы нашым селянам — уцекачом кніжкі аб Беларусі, расказуючы аб яе долі, вучачы чытаць старых і малых. Зерняты кіданыя Станкевічам у праўдзівую глебу ні асталіся безплоднымі. Хутка маладыя і старшыя селяне пачалі зьбірацца у гурткі. То там, то сям пачалі адбывацца сходкі. Пачулася патрэба мець сваю кватэру для нацыянальных гурткоў, але беднасьць нашых селян ні пазваляла яе здаволіць.

І аднак, дзякуючы усе таму-ж Я. Станкевічу ужо на першым тыдні па Вялікадні у 1917 годзе у новым тэатры беларусы здолелі паставіць сваю вечарыну, якая з аднаго боку павінна была прыцягнуць пад беларускі штандар шырэйшыя колы, а з другого даць матэр'яльныя сродкі для працы. Моральны усьпех вечару быў найпамысльнейшым, матэр'яльна так сама: чыстаго даходу атрымалося 435 рб. с капейкамі.

Далей удалося дастаць дазваленне ад загадчыцы Некрасаўскай бібліотэкі склікаць там сходы, калі чытальня ні будзе занята, без усялякай платы, апрача расходаў на электрычнасьць і за вечары сторажу. Дзякуючы гэтаму нам удалося зрабіць несколькі агульных сходаў. Расійцы бачыўшыя гэтыя сходы ні маглі пасьля надзівіцца. Задзіўляла і будзіла зайздрасьць у іх тая адналітасьць думак, якая панавала на гэтых сходах. Тутака, праве, нізаметнай рабілася рожніца між багатым і бедным, адукаваным і анальфабэтам, усе былі—беларусы каторых туга на радзімым краі сабрала пад адзін дах нараіцца аб супольным дзеле—сваім ніщчасьці і нішчасьцях роднай стараны.

Расійцы хутка апамятаваліся ад свайго задзіўлення, калі убачылі да чаго вядуць гэтыя сходы і заварушыліся каля усякіх перашкодаў. Асаблівую увагу сваю зьвярнулі яны на «вінавайцу» прабуджэння беларусаў у Казані, арганізатара і кіраўніка усей культурнай працы Я. Станкевіча. Нават прыгражалі сарваць з яго ахвіцэрскія апалеты і каб ні страх перад ваенным судом,—напэўне зрабілі-б гэто. Аднак нялюбы імі «вінавайца» ні уныва́ў. Нібавам дзякуючы яго стараниям афіцыяльна адкрыўся у Казані беларускі гурток пад наймэннем «Пралеска» які пад кіраўніцтвам Станкевіча павёў шырокую нацыянальна-культурную працу. На нішчасьце ваенныя павіннасьці Станкевіча, каторы мусіў як ахвіцэр расійскай арміі ісьці на фронт бараніць чужую яму справу, пазбавілі «Пралеску» яе энэргічнаго кіраўніка— арганізацыя пачала хірэць і скарачаць сваю чыннасьць...

В. Грынэвіч.

(Працяг будзе).

*) Гл. № 73.

Друкарня Я. А. Грынблята.